# СУЧАСНАЯ ПЕСЕННАЯ ЛІРЫКА: ЖАНРАВАЯ ДЫНАМІКА, КАНТЭКСТ, АСАБЛІВАСЦІ ПАЭТЫКІ

**А. І. Бельскі**

*Доктар філалагічных навук, прафесар, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт,*
*пр-т Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь, alesbelsky@yandex.by*

Разглядаецца песня як адметны тып верша і мегажанр, адзначаецца, што яна мае свой гісторыка-культурны і літаратурны кантэксты. Аўтар вызначае ў беларускай паэзіі лірычна-песенную плынь, акрэслівае некаторыя тэндэнцыі ў развіцці сучаснай песеннай лірыкі. Асноўная ўвага засяроджана на творчасці паэтаў-песеннікаў У. Мазго, Л. Пранчака, К. Цыбульскага, А. Бадака.

***Ключавыя словы:*** літаратурная песня; песенна-паэтычныя творы; мадэрнізацыя жанру; паэты-песеннікі; літаратурна-песенная традыцыя; музычнасць; спеўнасць; рытмічны малюнак верша.

# СОВРЕМЕННАЯ ПЕСЕННАЯ ЛИРИКА: ЖАНРОВАЯ ДИНАМИКА, КОНТЕКСТ, ОСОБЕННОСТИ ПОЭТИКИ

**А. И. Бельский**

*Доктор филологических наук, профессор, Белорусский государственный университет,*
*пр-т Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь, alesbelsky@yandex.by*

Рассматривается песня как отличительный тип стихотворения и мегажанр, отмечается, что она имеет свой историко-культурный и литературный контексты. Автор определяет в белорусской поэзии лирико-песенное течение, подчеркивает некоторые тенденции в развитии современной песенной лирики. Основное внимание сосредоточено на творчестве поэтов-песенников В. Мазго, Л. Прончака, К. Цыбульского, А. Бадака.

***Ключевые слова:*** литературная песня; песенно-поэтические произведения; модернизация жанра; поэты-песенники; литературно-песенная традиция; музыкальность; песенность; ритмический рисунок стихотворения.

# CONTEMPORARY SONG LYRICS: GENRE DYNAMICS, CONTEXT, FEATURES OF POETRY

**A. I. Belski**

*Hab. PhD, Professor, Belarusian State University,*
*4 Independence Avenue, 220030, Minsk, Belarus, alesbelsky@yandex.by*

The article considers the song as a distinctive type of poem and mega-genre, noting that it has its own historical, cultural and literary contexts. The author defines a lyrical and song trend in Belarusian poetry, outlines some trends in the development of modern song lyrics. The main attention is focused on the works of songwriters V. Mazgo, L. Pranchak, K. Tsybulsky, A. Badak.

***Keywords:*** literary song; song and poetic works; modernization of the genre; songwriters; literary and song tradition; musicality; songfulness; rhythmic pattern of the poem.

Беларуская лірыка канца XX – пачатку XXI ст. у стылёвым плане разнастайная, паліфанічная. У. Гніламёдаў у адпаведнасці з выяўленчым і выразнымі пачаткамі вызначае ў сучаснай беларускай паэзіі асноўныя мастацка-стылёвыя плыні, ён піша: «…мы выдзелілі б не менш шасці: лірыка-апавядальную, рамантычную, публіцыстычную, філасофска-аналітычную, мастацка-сінкрэтычную і ўніверсальна-інтэлектуальную» [1, с. 151]. У гэтай сувязі даследчык слушна гаворыць пра «прынцып дапаўняльнасці: агульны для ўсёй беларускай паэзіі мінулага лірыка-апавядальны стыль (з пэўнымі асабовымі варыянтамі) становіцца ўсяго толькі адной з яе стылявых плыняў, хаця і вельмі пашыранай» [1, с. 151]. У цэлым можна пагадзіцца з такім класіфікацыйным падыходам, узяць яго за аснову. Аднак, на наш погляд, паводле песеннага тыпу верша і жанрава-відавой адметнасці варта вылучыць адпаведна асобную стылёвую плынь – лірыка-песенную. На тое ёсць усе падставы. У беларускай паэзіі існуе надзвычай вялікі корпус песенных тэкстаў, многія з якіх ствараліся адмыслова ў жанры песні. Уласна кажучы, усё ў паэзіі і пачыналася з песні-малітвы, з народнай песні (песенна-інтымная лірыка, калядкі і інш.), якая сваёй гучальнасцю, вобразнасцю, той ці іншай стылёвай інтэнцыяй уплывала на літаратурна-мастацкую творчасць паэтаў: Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча, Я. Купалу, Я. Коласа, М. Багдановіча, А. Гаруна і інш.

Пра спеўнасць, музычнасць, песеннасць беларускага паэтычнага слова напісана нямала. Так, В. Бечык даў свайму артыкулу пра П. Броўку красамоўную назву «Што сэрца праспявала…» [2, с. 4], ён заўважае ў лірыцы паэта «самыя тонкія душэўныя струны» [2, с. 10, 20]. Пра М. Танка і яго паэзію гэты ж крытык назваў артыкул «Песня аб Радзіме» [2, с. 22], дзе, у прыватнасці, захапляецца: «Вось як творацца гэтыя вершы-песні. З такой апантанасцю і з такім напалам…» [2, с. 23]. В. Бечык падкрэслівае ўменне Р. Барадуліна выказвацца «на самай пяшчотнай і шчымлівай ноце», адзначае яго паэтычнае майстэрства інтанавання, рытмастварэння, гукапісу («Захоча – … сугуччы ўвойдуць углыб радкоў; захоча – надасць імклівы рытм…»), звяртае ўвагу ў барадулінскай лірыцы на вельмі істотную мастацка-выяўленчую асаблівасць – «плыткі, музычны метафарызм» [2, с. 86, 87]. В. Бечык вылучае ў лірыцы Н. Гілевіча «песенна-меладычны пачатак» [2, с. 190], заўважае характэрную, тыповую ўнутраную інтэнцыю «ў паэтаў новага пакалення… нейкую ўнутраную музыку святла, радасці, прыгажосці…» [2, с. 208].

Можна таксама спаслацца на А. Лойку як даследчыка, тонкага знаўцу паэзіі, які неаднойчы робіць акцэнт на спеўнасці і музычнасці беларускага лірычнага слова, яго блізкасці да народна-песеннай мелодыкі. Вобразы і інтанацыі беларускага народнага меласу ён маркіруе ў паэзіі Е. Лось, А. Вялюгіна, Р. Барадуліна і іншых паэтаў.

А. Лойка ўмеў заўсёды разгледзець эстэтычна сутнаснае, ідэнтыфікаваць ключавыя моманты і фактары паэтычнага самавыяўлення аўтара, паказаць асаблівасці паэтыкі, творчага майстэрства. Ён мае рацыю, пішучы наступнае: «Песня Рыгору Барадуліну… дыктуе рэгулярна-песенную строфіку, рыфміку, інтанацыю» [3, с. 239]. Ды і сам Лойка-паэт у лірычнай творчасці дэманстраваў спеўнасць, меладычнасць гучання паэтычных радкоў. Невыпадкова яго вершы загучалі песнямі, ён стварыў «Гімн БДУ», паэтычна-музычную нізку твораў «Беларускае танга» і інш. Т. Мацюхіна ў артыкуле «Імпрэсіяністычнасць лірыкі Алега Лойкі», раскрываючы адметнасць творчай індывідуальнасці аўтара, вызначае такія рысы яго лірычнай паэзіі, як «музычнасць, гукавыяўленчасць… рытмічнасць малюнка» [4, с. 73]. Музыка і песня былі, можна сказаць, існасцю, страсцю, стыхіяй Алега Лойкі: ён любіў спяваць, іграў на акардэоне, а ўнутраны водгук яго – шчыры спеў сэрца, прачулыя лірычныя інтанацыі і мелодыі. Стан, вызначальную інтэнцыю яго самавыяўлення яскрава перадаюць наступныя радкі: «Бо сэрца на песню бярэцца – // На цэлы свет спяваць» [5, с. 100]. К. Цыбульскі, слухаючы Алега Антонавіча, як і многія іншыя студэнты, заўважыў у гаворцы-маўленні прафесара і паэта «абертоны яго меладычнага голасу» [4, с. 274]. А. Лойка называе старэйшага паэта і сябра М. Аўрамчыка паэт-сустрэча [3, с. 254], пра яго ж самога можна сказаць так: паэт-песня. Як, зрэшты, і пра яго вучняў: паэтаў-песеннікаў У. Мазго, К. Цыбульскага, А. Бадака.

Літаратурная (прафесійная) песня – традыцыйны і ўстойлівы жанр творчасці, яна пастаянна, нязменна прысутнічае ў беларускай і сусветнай культурнай прасторы. Трэба сказаць, што не заўсёды ёй аддавалі належнае сярод іншых жанраў, як і заставаліся недаацэненымі самі стваральнікі нацыянальнай песні. Аднак з цягам часу паэтычна-песенны жанр творчасці пачаў набываць культурна-каштоўнаснае значэнне і навуковае асэнсаванне, а сама беларуская песня набыла папулярнасць, шырокую вядомасць. Сярод аўтараў слоў былі П. Броўка, А. Куляшоў, М. Танк, А. Бачыла, А. Астрэйка, Н. Гілевіч, Р. Барадулін, Г. Бураўкін, А. Ставер, У. Карызна і іншыя таленавітыя паэты, і найперш дзякуючы таму, што выканаўцы песенных твораў – выдатныя спевакі, ансамблі, у першую чаргу тут трэба назваць «Песняры», «Сябры», «Верасы». Беларуская песня загучала, і яе падхапілі па ўсім Савецкім Саюзе. Сярод паэтаў-песеннікаў вылучаецца імя Адама Русака (1904–1987), аўтара знакамітых шлягераў «Бывайце здаровы», «Лясная песня» («Ой, бярозы ды сосны...»), «Не шукай», «Не за вочы чорныя» і інш. Ён – класік беларускай песні, па сутнасці з’яўляецца адным з заснавальнікаў літаратурна-песеннай традыцыі ў літаратуры і культуры Беларусі. Менавіта ў жанрава-эстэтычным кантэксце гэтай традыцыі трэба разглядаць творчасць сучасных паэтаў-песеннікаў. Пішучы пра А. Русака, харавы дырыжор і музыказнавец Г. Цітовіч выдатна патлумачыў феномен лірычна-песеннай творчасці гэтага паэта: «…у яго вершах-песнях адчуваецца ўнутраная музыка: між песенных радкоў тут нябачна прысутнічаюць лініі нотнага стану, на якім уяўляецца лад, рытм і інтанацыйныя контуры напеву» [6, с. 5].

Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што масавая і эстрадная песня ў савецкі час былі шырока запатрабаванымі, тады цаніліся меладызм і сэнсавая нагрузка ў паэтычным тэксце, пакладзеным на музыку. На слыху былі імёны савецкіх і рускіх паэтаў-

песеннікаў М. Ісакоўскага, А. Фацьянава, Р. Раждзественскага, А. Дзяменцьева, Я. Далматоўскага, М. Матусоўскага, М. Дабранравава і інш. Экстраардынарным фактам постсавецкага часу, які засведчыў надзвычайны фенаменальна-феерычны поспех і міжнароднае прызнанне песні як жанру, з’яўляецца прысуджэнне Нобелеўскай прэміі па літаратуры ў 2016 годзе паэту і спеваку Бобу Дылану «за стварэнне новых паэтычных выразаў у вялікай амерыканскай песеннай традыцыі» [7]. Гэта ўзнагарода ў культурных і літаратурных колах выклікала неадназначную ацэнку і крытыку.

Калі задацца пытаннем: а якіх больш за ўсё вершаваных тэкстаў створана паэтамі ў свеце – у жанравым плане, у тэматычным рэчышчы. І хоць не існуе такой статыстыкі, можна меркаваць, што песня – ці не самым распаўсюджаны, самы масавы жанр. І, напэўна, больш за ўсё напісана песень пра каханне. Паэтамі на розных мовах створана і пішацца вялікая колькасць песенных твораў, прытым у розных жанравых катэгорыях, мадыфікацыях: пачынаючы ад рамансаў і да сучаснага шансону ды, скажам, рок-песні. Па сутнасці вялікі комплекс ці сістэма песенна-паэтычных твораў – гэта мегажанр, які ўяўляе сабой шматаспектны аб’ект даследавання. Да таго ж адбываюцца інтэграваныя працэсы ўзаемадзеяння і жанравага сінтэзу пры стварэнні песенных тэкстаў, што абумоўлена развіццём найноўшай музыкальнай культуры, лічбавых тэхналогій, відэаіндустрыі, шоу-бізнесу, існаваннем пэўных падыходаў і стратэгій на радыё, трансфармацыяй моладзевай камунікацыі і інш.

Гісторыя беларускай песні ведае творчыя ўзлёты, свае дасягненні і набыткі. Новы этап актывізацыі літаратурна-песеннай творчасці адбыўся ў канцы XX ст., на хвалі духоўна-культурнага адраджэння, калі пачалі ладзіцца нацыянальныя музычныя фестывалі, конкурсы, канцэрты. Склалася творчая кагорта, цэлая плынь паэтаў-песеннікаў маладзейшага пакалення (Л. Пранчак, Л. Дранько-Майсюк, А. Бадак, У. Мазго, К. Цыбульскі, М. Шабовіч і інш.).

Беларуская песня на сёння – з’ява неаднародная, ахапіць усе яе жанравыя разнавіднасці і найноўшыя музычныя кірункі (скажам, рэп, пот-панк, хард-рок, фолкметал і інш.), у межах якіх створаны тэксты, не ўяўляецца магчымым. Мы звернемся да традыцыйнага жанру літаратурнай песні і паспрабуем высветліць, якія новыя працэсы і тэндэнцыі адбываюцца ў сучаснай песеннай лірыцы. Зрэшты, адну з такіх першых спроб зрабіла больш як дзесяць гадоў таму І. Бароўская, якая з’яўляецца актыўнай даследчыцай беларускага песеннага матэрыялу [8].

У класічных традыцыях песеннага жанру працуюць паэты-песеннікі У. Мазго, К. Цыбульскі, Л. Пранчак, А. Бадак. Дарэчы, усе названыя паэты ў свой час сталі аўтарамі зборнікаў літаб’яднання філфака БДУ «Узлёт», якім кіраваў прафесар і паэт А. Лойка. Імёны У. Мазго, К. Цыбульскага, Л. Пранчака фігуруюць у «Вёснах» (1977), А. Бадак выступае з вершамі ў «Вуснах» (1985). Тэматыка вершаў-песень паэтаў у асноўным традыцыйная, пераважаюць у іх творчасці тэмы Радзімы і кахання. Лірычнасць, пранікнёнасць і экспрэсіўнасць паэтычнага слова выяўляецца ў песенных тэкстах К. Цыбульскага «Дымок Радзімы», Л. Пранчака «Беларусь, ты – мая!», У. Мазго «Малая радзіма». К. Цыбульскі так выказвае сваё пачуццё духоўнай еднасці з радзімай: «Дымок Радзімы такі салодкі, // Дымок Радзімы, жылі тут продкі. // Дымок радзімы, ён родны самы, // Бо тут калыска і рукі мамы» [9, с. 18]. Феномен сінтаніі

(эмацыйнага сугучча) пры выкананні падобных песень, у тым, што знаёмыя дарагія сэрцу вобразы і прачулыя інтанацыі выклікаюць унутраны водгук, суперажыванне. Ствараючы песні пра радзіму, аўтары часта апелююць да памяці чалавечага сэрца, таго пачуццёвага і ментальнага, жыццёва сутнаснага, што заключана ў быццёва-каштоўнаснай формуле ці літаратурнай канстанце «ўсе мы з хат» (выраз Я. Сіпакова). Адчуванне сувязі з каранямі, сваімі вытокамі, бацькаўшчынай, зямлёй продкаў узмацняецца і нават абвастраецца ў многіх людзей, асабліва былых вяскоўцаў, з узростам, з вышыні агледзінаў пражытага, зведанага, з усведамленнем сапраўднага, галоўнага ў жыцці. Вёска для многіх засталася шчымлівым успамінам, а вясковае маленства – незваротнае былое, страчаны рай. Настальгічны стан і элегічныя матывы ўвасоблены ў песнях на словы У. Мазго «Бацькоўская хата», Л. Пранчака «Я вярнуўся дадому», К. Цыбульскага «Бацькоўскі зруб». Эфект масавай песні з арыентацыяй на стварэнне поп-хіта спрацаваў у выпадку з песняй на словы Л. Пранчака «Хата бацькоў» (іншая назва – «Не прадаецца хата бацькоў»). У жанрава-стылістычным плане гэты песенны твор – рэчытатыўна-дэкламацыйны тып тэксту, дзе лірычнае пачуццё ўскладняецца, драматызуецца. Лейтматыўны пафас і інструментоўка падобных вербальных канструкцый, у рытмарадзе якіх заключаны паэтычны інтанацыйна-сэнсавы код, кантылентнасць гучання слоў, дае магчымасць для адпаведнага музычнага ўвасаблення і вакальнага выканання: разняволенасці, свабоды дыхання, распеўнасці, шырыні гучання фразы, асабліва прыпеву. Ідэйнасць, патрыятычнае пачуццё паэты найчасцей імкнуцца выявіць праз лірычныя сродкі («Дарога да маці» на словы К. Цыбульскага, «Сланечнік» на словы Л. Пранчака і інш.).

Жанравы трэнд на паэтычна-песенны верш пра каханне сёння дамінуе, прадвызначае яскрава выяўлены кірунак творчасці і адпаведна пастаяннае павелічэнне колькасці тэкстаў і аўтараў. Асобнай увагі і аналізу вымагаюць песні, якія ўваходзяць у плэй-лісты недзяржаўных ці камерцыйных радыёстанцый і такім чынам трапляюць у ратацыю, прычым гучаць штодзённа і па некалькі разоў ды яшчэ на фоне пракруткі замежных музычных хітоў. Крытэрыі адбору песень для эфіру для размоўнага радыё добра вядомы: «фармат/не фармат», інакш кажучы, сваю ролю ў значнай ступені пры фарміраванні песеннага кантэнту адыгрывае рынкавая музычная індустрыя з яе прамоўшнам, маркетынгам. Якасць музыкі і песні стварае рэпутацыйны, іміджавы брэнд той ці іншай FM-станцыі.

Вершаваныя тэксты прафесійных паэтаў-песеннікаў на тэму кахання ў многіх выпадках сведчаць, можна сказаць, пра статусна-маркіраваны прадукт, яго мастацкую якасць і тым самым, нягледзячы часам на «не фармат», трымаюць эстэтычную планку жанру насуперак яго дэфармацыі. З лепшых твораў пра каханне можна вылучыць песні на словы У. Мазго «Варажба», «Вербніца», Л. Пранчака «Пяшчота», «Дождж» («Лівень маёй тугі»), «Каханая», К. Цыбульскага «Зорка-заранічка», А. Бадака «Заваражаная фея», «Падаюць зоры», «Птушка залатая». Усе гэтыя лірычна-настраёвыя песні – «мелодыі душы», акрыленыя, узнёсла-летуценныя, радасна-трапяткія ці спавядальна-тужлівыя, шчымліва-кранальныя. У тэкстах песенных твораў выказваецца інтымнае, таемнае – і гэта стварае аўру закаханасці, замілавання,

пяшчоты: «Навальніца, навальніца ўначы // У вачах тваіх шугае бліскавіцай. // Зацалуй мяне, загушкай, зашапчы – // І маўчы: // Наталіцца дай вячыстай таямніцай» [10, с. 117].

У прафесійным песенным жанры сёння заўважаецца тэндэнцыя і да жартаўлівага, гумарыстычнага ўвасаблення тэмы кахання – гэта, з аднаго боку, працяг традыцыі, як скажам, у песнях «На сцяжынцы вечаровай» на словы У. Карызны, «Тры таполі каля дуба» на словы К. Цыбульскага, а, з другога, адбываецца і пошук аўтарамі сучаснай драйвовай рытмікі і стылістыкі, разлічанай сваім імпэтам, дынамікай, іскрыстасцю захапіць слухача, як, напрыклад, «Вясковы лавелас» на словы В. Карпанава і інш. Безумоўна, выкананне песень жартоўнага зместу прадугледжвае яркую, эфектную артыстычную гульню, выкарыстанне пры гэтым прыёмаў камізму, эпатажнасці, шаржыравання.

Стварыць атмасферу свята, урачыстасці, драйву закліканы песні-вітанні, песні-зычэнні, прасякнутыя духаўздымнасцю слова, энергіяй рытму. У многіх песнях выяўляецца ментальна-беларускае – адкрытасць і шырыня народнай душы, гасціннасць, зычлівасць, чалавекалюбнасць. Жыццеаптымізмам, вітальнай радасцю і сардэчнасцю пачуццяў напоўнены песні «Гаспадар», «Добрыя людзі» на словы А. Бадака, «Добрым людзям» на словы К. Цыбульскага, «Талака» на словы Л. Пранчака і інш. Заўважаецца ўстаноўка на народнасць, прастату, даходлівасць, імкненне стварыць народны хіт, які падхапіла б масавая аўдыторыя. Пры гэтым надзвычай важнай складовай поспеху песні ці трэку з'яўляецца кампазітарскі талент, майстэрства аранжыроўкі і мастацкі ўзровень выканання.

Такім чынам, на сучасным этапе ў развіцці прафесійнага нацыянальнага песеннага мастацтва назіраецца пераемнасць з папярэдняй класічнай вербальна-эстэтычнай традыцыяй, што абумоўлена імкненнем захаваць вызначальныя жанрава-стылістычныя рысы і асаблівасці паэтыкі беларускай песні. Па-ранейшаму моцным бокам вершаваных тэкстаў, пакладзеных на музыку, з'яўляецца іх семантычная нагружанасць, сэнсавая выразнасць, лірызм, меладычнасць, спеўнасць паэтычнага слова. Нягледзячы на існаванне мастацкіх канонаў і стэрэатыпаў, адбываецца і пэўная мадэрнізацыя, трансфармацыя «старога» жанру: пошук новага маўлення, найбольш адпаведных інтанацыйных і стылістычных фігур, творчых прыёмаў, якія дапамагаюць стварыць тэкставую контурную аснову для сучаснага музычна-рытмічнага малюнка. Самае істотнае – вербальна-мастацкая культура і тэхніка вершавання сучасных прафесійных паэтаў-песеннікаў прыкметна розніцца ад той няякаснай і сумнеўнай прадукцыі, шырспажыву, які выдаецца за літаратурную песню.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. *Гніламёдаў У.* Ад даўніны да сучаснасці: нарыс пра беларускую паэзію. Мінск: Маст. літ., 2001.

2. *Бечык В.* Прад высокаю красою… : літ.-крытыч. арт. Мінск: Маст. літ., 1984.

3. *Лойка А.* Галгофа : кніга лёсаў / А. Лойка. Слонім: ГАУПП «Слонім. друкарня», 2001.

4. Чалавек з сонечнаю ўсмешкай : кніга пра Алега Лойку / рэдкал.: А. Бельскі (уклад.) [і інш.]. Мінск: Зміцер Колас, 2019.

5. *Лойка А*. Грайна : паэзія. Мінск: Маст. літ., 1986.

6. Песні на словы Адама Русака / уступ. арт. Г. Цітовіча. Мінск: Беларусь, 1980.

7. Лаўрэатам Нобелеўскай прэміі па літаратуры стаў Боб Дылан [Электронны рэсурс]. URL: https://sputnik.byra&ie=UTF-8&oe=UTF-8 (дата звароту : 11. 09. 2024).

8. *Бароўская І. А*. Беларуская песенная лірыка: новае ў стылі, формах і вобразах (аналіз творчага пошуку) // Изв. Гомел. гос. ун-та им. Ф. Скорины. Сер.: Гуманит. науки. 2012. № 1 (70). С. 100–104.

9. *Цыбульскі К*. Я застаюся тут : паэзія. Мінск: Беларусь, 2021.

10. *Мазго У*. Знічкі вечнасці : вершы, песні, лірычныя мініяцюры. Мінск: Беларусь, 2020.